# Векапомнае



# УСПАМІНЫ НАШАГА ЗЕМЛЯКА

## І. З АЎТАБІЯГРАФІІ

Нарадзіўся 1 чэрвеня 1917 года ў с. Бяседавічы Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Хоцімскай няпоўнай сярэдняй школы ў 1933 годзе паступіў у Віцебскі рабфак пры падінстытуце, а ў 1935 годзе па закліку камсамола дабраахвотна пайшоў вучыцца ў Кіеўскае пяхотнае вучылішча, якое з адзнакай закончыў у 1938 годзе.

У далейшым праходзіў службу на камандных пасадах у Закаўказскай ваеннай акрузе.

## II. ВАЙНА

Ваенны лёс на маю долю вызначыў удзел у 250-дзённай гераічнай абароне Севастопаля. Гэта быў цяжкі час для Радзімы — ліпень-жнівень 1942 года, калі вораг вёў паспяховае наступленне на ўсіх участках фронту. Гітлер надаваў вялікае значэнне Крымскаму паўвостраву, як аднаму з плацдармаў

рам узвода разведкі атрада.

Першае маё баявое хрышчэнне ў саставе хоцімскіх партызан — баявая аперацыя па разгрому паліцэйскага гарнізона ў в. Ельня, у якой я дзейнічаў, будучы радавым партызанам. Гарнізон у начным баі быў разгромлен, і пасля гэтай аперацыі мяне назначылі камандзірам узвода. У далейшым я і мае салдаты-разведчыкі актыўна праводзілі разведку варожых гарнізонаў у вёсках Батаева, Дубраўцы, Ельні, Ліпаўцы, Бяседавічы, Горні, Ніўнае і ў Хоцімску. З наступленнем зімовых халадоў атрад зрабіў вялікі пераход у клятнянскія лясы Бранскай вобласці, дзе збіралася шмат партызанскіх злучэнняў, каб лягчэй было весці баі з карнікамі. На шляху ў клятнянскія лясы ў раёне Горні калона трапіла ў засаду карнікаў, якія, у асноўным, складаліся з уласаўцаў. У гэтым баі мы панеслі вялікія страты ад агню праціўніка, шмат было і абмарожаных.

расфарміраванню злучэння вярнуўся ў армію. Камандаваў батальёнам, палком, дывізіяй і працаваў у аператыўных штабах ваенных акруг.

Вельмі добрыя ўспаміны ў мяне засталіся аб партызанах атрада Шамякіна: аб начальніку штаба атрада (прозвішча забыў), аб начальніку разведкі Кузняцове. Асабліва хачу сказаць добрае слова аб старым камуністе Іване Антонавічы Мінчанку. Ён добра мяне сустрэў, увёў у курс справы аб становішчы ў атрадзе. Быў ён прыкладам адданасці, мужнасці, таварыскасці і добрым выхавацелем. З добрага боку памятаю Лукер'ю Карпаўну Баравую, яе дачку Аню і сына, 16-гадовага юнака Паўла Баравога, які разам са мной ваяваў у злучэнні Фёдарава да канца вайны. Пасля вайны трагічна загінуў. Добрыя ўспаміны засталіся аб Левертаве, Куляшовай і малодшай дачцы Івана Антонавіча Мінчанка Клаўдзіі, якая ў свае 16 гадоў пайшла з маці ў Хоцімск і вельмі многа прыносіла нам разведданых аб становішчы ў пасёлку. Зараз яна пражывае ў Адэсе.

І нарэшце ўспомню яшчэ адзін эпізод. Пры выхадзе з клятнянскіх лясоў немцы і паліцаі ў спробе перашкоды выхаду з акружэння ў в. Арцюхі Хоцімскага раёна зрабілі засаду, якая намі была добра разведана і з ходу знішчана. У гэтым баі было знішчана больш ста немцаў і паліцаяў, тры аўтамашыны. Нашы страты: тры чалавекі забіта, сем паранена. У далейшым наша група стала групай дальняй разведкі. Мы аддаляліся да 100 кіламетраў і больш ад галоўных сіл злучэння. Вывучалі састаў праціўніка, інжынерную абстаноўку, і злучэнне з ходу знішчала сілы ворага.

для развіцця наступлення на Каўказ з мэтай авалодання асноўнымі раёнамі здабычы нафты. Таму за галоўную ваенна-марскую базу разгарэлася гарачая бітва. 250 дзён і начэй мы вялі баі ў акружэнні з пераўзыходзячымі сіламі ворага.

Пасля ўходу нашых войск з Севастопаля 2 ліпеня 1942 года, застаўшыеся не па нашай віне неэвакуіраванымі, мы адыйшлі на мыс Херсона, дзе на працягу васьмі дзён і начэй у вельмі цяжкіх умовах змагаліся з ворагам да апошняга

Разрозненымі групамі мы дасягнулі намечанага раёна ў клятнянскіх лясах, дзе размясціліся лагерам, пабудавалі зямлянкі і прыводзілі сябе ў парадак. Але не доўга нам прыйшлося «мірна» адпачываць. Немцы падцягнулі свае адмабілізаваныя дывізіі і шмат асобных часцей карнікаў і пачалі з усіх бакоў наступаць у раёны размяшчэння партызанскіх злучэнняў. Камандаваннем злучэнняў і атрадаў было прынята рашэнне выйсці з гэтага акружэння ў батаеўскі лес

Калі ў клятнянскіх лясах Бранскай вобласці сабралася

патрона. Аказаўшыся ў ліку палонных, не звяртаючы ўвагі на небяспеку, праз тры дні я ўцёк і з вялікай цяжкасцю з Крыму перабраўся ў чарнігаўскія і беларускія лясы, сустрэўся з партызанамі і працягваў біць ворага. Я быў малады афіцэр, было мне 24 гады. Але прыбыў у партызанскі атрад добра абстраляным салдатам. Двойчы быў паранены, кантужан.

## III. ПАРТЫЗАНЫ

З партызанамі я сустрэўся ў канцы жніўня 1942 года ў вёсцы Панкі Хоцімскага раёна, дзе ў той час дыслацыраваўся атрад пад камандаваннем тав. Шамякіна. У 1942 годзе з партызанамі сустрэцца было не проста, нялёгка, а да немцаў, паліцаяў трапіць было лёгка. Але ў цяжкія моманты жыцця дапамагаў наш гераічны народ, асабліва жанчыны, якія, рызыкуючы сваім жыццём і жыццём сям'і, укрывалі такіх, як я і садзейнічалі сустрэчы з партызанамі. У прыватнасці, мяне пазнаёміла з хоцімскімі партызанамі работніца Панкаўскага лясніцтва Каця Кудраўцава, якая ў 1943 годзе была расстраляна ў Касцюковіцкай турме. Нягледзячы на недавер да мяне, як да «акружэнца», у партызанах я сустрэў шмат нашых хоцімскіх землякоў. І гэта да некаторай ступені паскорыла маю «праверку» камандзірам атрада т. Шамякіным. Праз месяц я быў назначан камандзі-

і ў Карукоўскія лясы Чарнігаўскай вобласці. Для разведкі маршрута выхаду была створана разведвальная група ў саставе двух разведузводаў. Адзін — з атрада Шымкіна і другі — са злучэння партызанскіх атрадаў двойчы Героя Савецкага Саюза Аляксея Фёдаравіча Фёдарава. Камандзірам разведгрупы быў назначан я. Было гэта 25 студзеня 1943 года. Мы ўначы разведалі маршрут паўночней в. Нікалаеўкі (гэта была партызанская вёска, у раёне Нікалаеўкі быў наш партызанскі аэрадром). Зіма была суровая, мароз даходзіў да 25 градусаў і больш, шмат было снегу. Так па намечанаму маршруту група разведчыкаў у саставе 40—50 чалавек верхам на конях і пешшу пракладвалі маршрут выхаду партызан па маршруту: Клятня, Ніўнае, Бяседавічы, Юзяфоўка, Баханы, Ельня. Так мы (наш узвод шамякінцаў) аказаліся ў саставе чарнігаўскіх партызан.

На гэтым маё знаходжанне ў саставе хоцімскіх партызан закончылася, і я да канца дзеяння ў тыле ворага быў у саставе Чарнігаўска-Валынскага злучэння партызанскіх атрадаў пад камандаваннем сакратара Чарнігаўскага, а пазней Валынскага падпольных абкомаў партыі. Тут я камандаваў групай дальняй разведкі, быў начальнікам штаба атрада імя Шчорса і начальнікам штаба злучэння партызанскіх атрадаў. А па

больш пяцісот партызан, немцы сканцэнтравалі вялікія сілы ў Хоцімску, Бялынкавічах, Крутым Яры, Мгліне, Клятні. Нашым разведчыкам прыходзілася заўсёды займацца гэтымі гарнізонамі. Актыўна нам дапамагалі насельніцтва гэтых раёнаў, у тым ліку і Хоцімска. Не магу не ўспомніць такі выпадак. Увайшлі мы ўначы ў Бяседавічы, я бачу непрыкметны агеньчык у сваёй хаце ў пасёлку Самараўск Бяседавіцкага сельсавета, але зайсці не мог, хаця дома не быў больш трох гадоў. Зайшлі разведчыкі, на сцяне звярнулі ўвагу на маё даваеннае фота ў форме лейтэнанта, а маці ім кажа, што, як пачалася вайна, нічога ад Усціна не чутна, а я быў побач. Калі пасля вайны прыехаў у водпуск і расказаў маці і бацьку, яны горка плакалі і гаварылі: «Ну, як ты мог сцярпець такое, быць каля дому і не зайсці?». Я ім адказаў: «Гэта ў імя маёй любві да вас, да сваіх землякоў у Бяседавічах».

Вось на гэтым і закончу свае ўспаміны ваенных гадоў.

З глыбокай павагай
**У. Ф. ДРАЗДОЎ,**
**генерал-маёр.**

**Драздоў, У.Ф. Успаміны нашага земляка** : [успаміны ваенных гадоў генерал-маёра У.Ф. Драздова] / У.Ф. Драздоў // Шлях Кастрычніка. — 1989. — 14 снежня. — С.2.